## На Гомельшчыне талакой аднавілі крыніцы

**Экалагічная кампанія “Уладкуем малую радзіму” стартавала ў Мінску 14 красавіка і працягваецца дагэтуль. У кожным рэгіёне акцыя мае свае асаблівасці і накірункі.**
**На Гомельшчыне больш увагі надалі добраўпарадкаванню крыніц.**

Супрацоўнікі абласнога камітэту прыродных рэсур- саў і аховы навакольнага асяродцзя не толькі ініцыявалі правядзенне акцыі “Ажывіць крыніцы Гомелыпчыны”, але і самі ўдзельнічалі ва ўладкаванні трох крыніц. Таксамі на заклік абласных эколагаў адгукнуліся прадстаўнікі працоўных калектываў, грамадскія арганізацыі, неабыя- кавыя людзі.

Ва ўладкаванні крыніцы каля населенага пункта Клёнкі Гомельскага расна гірымалі ўдзел прадстаўнікі грамадскага аб’яднання “Гомельская асацыяцыя дзяцей і моладзі” і мясцовыя жыхары.

Сапраўдная беларуская талака займалася добраўпа- радкаваннем крыніцы “Добрыца” каля вёскі Нагорныя Мазырскага раёна. Тут працавалі Маладзечанскае ўпраў- ленне буравых работ ААТ “Газпрам трансгаз Беларусь”, Козенскі сельсавет, Мазырскі вопытны лясгас, Мазырскае гарадское благачынне і спецыялісты Мазырскай райін- спекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродцзя.

Ва ўладкаванні крыніцы “Кустаўніца” каля пасёлка Крынічны Мазырскага раёна прынялі ўдзел Мазырская РІПРіАНА, ААТ “Газпрам трансгаз Беларусь”, філіял “Мазырскае падземнае сховішча газу”.

Старшыня Гомельскага абласнога камітэту прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Сушчэвіч запрашае мясцовых жыхароў далучацца да ак- цыі, падказваць месцы, якія патрабуюць добраўпарадка- вання, і абяцае, што людзі заўсёды змогуць разлічваць на падтрымку аблкамітэту і райінспекцыі ў такіх пачы- наннях.

“Беларусь мэтанакіравана прымае меры па рацыя- нальным выкарыстанні і ахове водных рэсурсаў. У краіне 109 гідралагічных помнікаў прыроды (крыніц), з іх рэс- публіканскага значэння — 29, мясцовага — 80, для якіх устаноўлены асаблівы рэжым аховы і выкарыстання. Гэ- тыя крыніцы на пастаянным кантролі ў прыродаахоўных службах, — кажа Алена Меляшкова, прэс-сакратар Мін- йрыроды. — У адгіаведнасці з дзяржаўнай праграмай “Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстан- не прыродных рэсурсаў” на 2016-2020 гады, Мінпрыро- ды праводзіць інвентарызацыю водных аб’ектаў — рэк, азёр, сажалак і вадасховішчаў, у тым ліку і крыніц. На сёння спецыялістамі РУП “Цэнтральны навукова-да- следчы інстытут комплекснага выкарыстання водных рэ- сурсаў” ужо праінвентарызаваны крыніцы, размешчаныя ў Брэсцкай вобласці. У 2018 годзе тэта работа вядзецца ў Гомельскай вобласці, а да 2020 года плануецца праінвен- тарызаваць крыніцы ва ўсіх абласцях.

Мы заклікаем усіх неабыякавых людзей узяць пры- клад з гамяльчан па прыцягаенні грамадскасці да добра- ўпарадкавання і захавання крыніц нашай малой радзімы”.

Ксенія ВЯРБІЦКАЯ

**Источник:** Родная прырода. – 2018. – № 9. – С. 14.